# ЯК МАГЧЫМА ПАЛІТЫЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ — БЕЛАРУСКАЯ ДАСЛЕДЧАЯ СІТУАЦЫЯ

## Даклад А. Казакевіча і дыскусія ў межах семінара «Сучаснае беларускае мысленне» Інстытут сацыялогіі і інстытут філасофіі НАН (2003 год)

***Асноўныя ўдзельнікі:***
*Казакевіч Андрэй (даклад),*
*Абушэнка Уладзімір, Бабкоў Ігар,*
*Кацук Мікалай, Мацкевіч Уладзімір*

© **ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА**
**(ISSN 1819-3625) №3 (2004) стр.47-53**

*Сталы міждысцыплінарны сэмінар «Сучаснае беларускае мысьленьне» быў створаны зь ініцыятывы беларускіх навукоўцаў і філёзафаў у 2001 годзе як агульная пляцоўка для рэфлексіяў над беларускай інтэлектуальнай і сацыяльнай сытуацыяй. Даклады і іх абмеркаваньне ў будынку Інстытуту Сацыялёгіі зрабіліся часткай інтэлектуальнай геаграфіі Менску.*

*Абушэнка Уладзімір.* На данном семинаре мы возвращаемся к традиционному стилю работы. Сегодня у нас есть тематическое выступление Андрея Казакевича. Андрей, пожалуйста.

*Казакевіч Андрэй.* **Як магчыма палітычнае даследаванне.** Тэма дакладу ахоплівае некалькі праблемаў. Вылучым два аспекты. Па-першае — праблема палітычнага даследавання як такая, гэта тэма асноўная і яна будзе дамінаваць. Па-другое — выяўленне механізмаў легітымацыі веды пра палітыку.

Структура дакладу пабудавана на шэрагу тэзаў. Першая мае наступны змест: ***палітычная веда для навуковае (акадэмічнае) супольнасці* [Беларусі] *не можа быць легітымавана праз веданне рэчаіснасці.*** Галоўнымі сродкамі легітымацыі палітычнае веды для беларускае навуковае супольнасці выступаюць:

- палітычная тэорыя альбо ідэалогія
- нарматыўнае даследаванне
- эмпірычная сацыялогія

Кожны з вызначаных «дыскурсаў» толькі часткова тычыцца праблемы палітычнае рэчаіснасці.

Эмпірычную сацыялогію нельга лічыць дастатковаю. Значная частка сацыялагічных даследванняў зяўляецца не столькі ведаю пра палітычную рэальнасць, колькі сімуляцыяй гэтае веды. Для Беларусі характэрна праблема валіднасці сацыялагічнае інфармацыі, недастаткова развіты стандарты сацыялагічных даследаванняў. Вынікі эмпірычных даследаваняў моцна залежаць ад палітычнае кан'юнктуры, што выразна заўважна пры вывучэнні вынікаў апытанняў перад палітычнымі кампаніямі. Больш за тое, значная колькасць даследаванняў замаўляецца для атрымання агульнае веды пра Беларусь (для параўнання з іншымі краінамі), і таму не прыдатная для рэканструкцыі яе палітычнае структуры. Аб'екты такіх даследаванняў (грамадзянская супольнасць, моладзевы рух, грамадская думка) таксама часта вызначаюцца замоўцамі па-за межамі краіны і выбіраюцца выключна ў залежнасці ад палітычных інтэнцыяў.

*Мацкевіч Уладзімір.* У мяне ёсць пытанне. Андрэй, ты сказаў, што палітычная веда не можа быць легітымавана праз веданне рэчаіснасці.

*Казакевіч Андрэй.* Акадэмічная палітычная веда на сёння — так.

*Мацкевіч Уладзімір.* Ці можа ўвогуле акадэмічная веда быць легітымаваная праз веданне рэчаіснасці? Якая навуковая веда можа быць легітымавана праз веданне рэчаіснасці? Калі задаць такое пытанне, то маю адказ — ніякая. Нават фізіка не можа быць легітымавана праз веданне рэчаіснасці. Рэчаіснасць супярэчыць навуковай ведзе.

*Казакевіч Андрэй.* Існуе вельмі вялікая розніца паміж сітуацыяй легітымацыі праз «набліжэнне» да рэальнасці (для фізікі гэта будзе эксперымент) і сітуацыяй, калі для легітымацыі пэўнае веды дастаткова ведання, напрыклад, толькі тэорыі.

*Мацкевіч Уладзімір.* Гэта вельмі істотнае пытанне.

*Казакевіч Андрэй.* Згодзен, я трошкі ўдакладню тэзу. Яе змест пабудаваны на адрозніванні сітуацыі, калі «веданне пра сітуацыю» з'яўляецца падставаю для легітымацыі даследавання, тэксту і г. д. У якасці прыкладу можна назваць тэксты якога-небудзь Бржэзінскага (імідж эксклюзіўнага знаўцы мае тут прынцыповае значэнне). Зусім іншую сітуацыю мы маем, калі сутыкаемся з тэкстамі кшталту «Сучасная заходняя палітычная тэорыя», «Тэорыя палітыкі Т. Парсанса» і г. д. У гэтым выпадку веданне пра палітычную сітуацыю ніякім чынам не легітымуе палітычную веду. Апошняе і ёсць сітуацыяй беларускай «веды-пра-палітыку», навуковая веда пра палітыку не пачынаецца для навуковае супольнасці з «веды-пра-сітуацыю». Тут вялікае значэнне мае толькі веданне тэорыі-ідэалогіі, юрыдычных нормаў і г. д. Гэта, натуральна, пэўнае спрашчэнне сітуацыі, але гэта ёсць сучасны mainstream. Апісанне тэарэтычных канструктаў ці нарматыўных актаў звычайна займае больш за дзве трэці прасторы тэкстаў пра беларускую партыйную сістэму, урад, парламент і нават палітычную культуру. Больш-менш надзейным кантактам з «рэальнасцю» з'яўляецца толькі эмпірычная сацыялогія, але пра яе статус і адносіны да рэальнасці ўжо сказана.

*Мацкевіч Уладзімір.* Чаму сітуацыя склалася менавіта такім чынам?

*Казакевіч Андрэй.* Я пакуль не гатовы адказаць на гэтае пытанне. Думаю, варта весці размову пра шэраг прычынаў, у прыватнасці, перыферыйнасць свядомасці значнай колькасці даследчыкаў, адсутнасць інфармацыйнае інфраструктуры, феномен «выцяснення палітычнага», але гэта патрабуе асобнага дакладу.

*Бабкоў Ігар.* Я не разумею, чаму тэза пра «рэчаіснасць» выклікае спрэчку. Ужыванне гэтага канцэпту цалкам мэтазгоднае. Кожная навука мае базавы міт пра легітымнасць пэўнае веды, які звязаны з тым, што яна адпавядае рэчаіснасці. У паліталогіі (наратыве, які тут прадстаўлены) гэты міт адсутнічае.

*Кацук Мікалай.* Мне кажется, что несколько преждевременно мы стали обсуждать проблему реальности, не услышав всех тезисов. Этот вопрос надо подвесить. У меня есть вопрос к Андрею: будет ли сильным преувеличением сказать, что более-менее устойчиво политическое знание, создаваемое в академическом сообществе, соотносится с реальностью только посредством эмпирической социологии.

*Казакевіч Андрэй.* Менавіта так. Эмпірычная сацыялогія на сёння з'яўляецца, бадай, адзінай легітымнай повяззю паміж акадэмічнай ведаю і «рэальнасцю». Хібы гэтай повязі былі часткова адзначаны.

*Бабкоў Ігар.* Наколькі я разумею, тут размова ідзе пра веду. Апісваецца, умоўна кажучы, сучасны тэкст палітычнага даследавання, нарацыя, і ў гэтай нарацыі няма блоку адсылкі да рэчаіснасці, яна не легітымуе сябе праз веданне рэчаіснасці.

*Казакевіч Андрэй.* Так. Прынамсі, веда пра рэчаіснасць (рэальнасць, якая разгортваецца перад вачыма) мае тут маргінальны статус.

*Абушэнка Уладзімір.* Таким образом, предъявлен тезис о структурах легитимации, которые разделяются оподленным научным сообществом. Данная структура не предусматривает для себя апелляцию к реальности в качестве обязательного элемента. В данных условиях полноценное (нормальное) политическое исследование не возможно.

*Казакевіч Андрэй.* Так. Гэта тое, што мы можам назваць «беларускай даследчай сітуацыяй». Спынімся на апісанні гэтае сітуацыі больш падрабязна. Існуе некалькі дыскурсаў і асноўных стратэгіяў паводзінаў пры даследаванні палітычнае прасторы, якія непарыўна заязаны з інстытуцыямі, у межах якіх яны цыркулююць.

Першае. Дыскурс «тэарэтычных даследаванняў па другасных крыніцах». Умоўна назавем яго паліталагічнай археалогіяй. Сярод інстытуцыяў, якія прадукуюць вызначаны дыскурс, выступаюць адукацыйныя ўстановы (перш за ўсё БДУ), Акадэмія навук і шэраг іншых. Цэнтральнае месца ў гэтых даследчых практыках адводзіцца вывучэнню «тэорыі» (тэорыі-ідэалогіі) і апеляцыі да розных тэарэтычных канцэптаў. Галоўная крыніца для даследаванняў — манаграфіі і тэк-

сты ў інстытуцыялізаваных перыядычных выданнях. Гэта тое, што мы называем другаснымі крыніцамі.

Другое. Эмпірычная сацыялогія і «аналітычныя» артыкулы, якія пішуцца на яе аснове. Інстытуцыянальна гэта ІСПД пры АП, НІСЭПД (незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў), Інстытут сацыялогіі і інш.

*Мацкевіч Уладзімір*. Што тычыцца першага «дыскурсу», не магчыма, каб палітычная веда базавалася на апеляцыі да ідэалогіі. Гэта проста нельга памысліць.

*Казакевіч Андрэй*. Памысліць нельга, але часам так здараецца.

*Абушэнка Уладзімір*. Вопрос не в том, можно либо нельзя это помыслить, а в том, как оно есть.

*Казакевіч Андрэй*. А як у гэтым выпадку вызначаць тэксты (у выглядзе артыкулаў, брашураў і нават манаграфіяў), якія прадукуюцца, напрыклад, у Інстытуце сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі прэзідэнта, дзе апеляцыя да ідэалогіі (панславісцкае, «беларускае дзяржаўнасці» ці проста прамоваў прэзідэнта) з'яўляецца цэнтрам аргументацыі. Ды і «апазіцыйная паліталогія» прадукуе дастаткова такіх тэкстаў.

*Мацкевіч Уладзімір*. Такія тэксты цяжка адносіць да навуковых.

*Казакевіч Андрэй*. Але можна, калі яны чамусьці ўспрымаюцца як навуковыя. Тут не ідзе гаворка пра тое, якія тэксты *мы* можам аднесці да навуковых. Вызначаная катэгорыя тэкстаў цыркулюе ў навуковай супольнасці і па-за яе межамі як навуковая. Гэта дадзенасць, *тое-што-ёсць*.

*Мацкевіч Уладзімір*. Некорректно апеллировать к некой циркуляции текстов. Есть научные тексты, есть ненаучные, и мы должны точно представлять себе отличие между этими текстами, по крайней мере, в рамках нашего семинара. Надо использовать точные понятия.

*Кацук Мікалай*. Тут разговор идет о научном знании, которое признается научным в рамках научного сообщества. Рассматривается именно этот феномен.

*Казакевіч Андрэй*. Я працягну. Два даследчыя масівы — эмпірычная сацыялогія і тэарэтычныя даследаванні па другасных крыніцах — утвараюць mainstream у полі навуковых і калянавуковых даследаванняў палітыкі. Mainstream, аднак, дапаўняецца шырокаю перыферыяй. Яе скаладаюць ідэалагічныя даследаванні па другасных крыніцах, масіў ad hoc рэфлексіўных тэкстаў, які адлюстроўвае пэўны палітычны досвед ці рэфлексію над канкрэтнай сітуацыяй. У якасці такіх рэфлексіўных тэкстаў можна ўзгадаць кнігу У. Мацкевіча пра беларускую дэмакратыю, а таксама шэраг тэкстаў, прысвечаных канцэпцыям «крэольства», «транскультурнасці» і г. д. Да гэтай групы мы далучаем і тэксты біяграфічнага характару, якіх, аднак, не так шмат. Гэта вельмі неаднародны масіў, але ён мае адну агульную рысу — падкрэсленую «нekананічнасць» сваіх даследчых практык. Апошні важны сектар — журналістыка (палітычная), якая складаецца з тэкстаў, змешчаных у прасторы сродкаў масавае інфармацыі. Такім чынам, ландшафт акрэслены. Ці маюцца пытанні ды заўвагі?

*Крупнік Сятлана*. Вы можете уточнить, что конкретно было представлено.

*Казакевіч Андрэй*. Сруктура масіву даследчых практык і тэкстаў у галіне палітыкі.

*Мацкевіч Уладзімір*. Калі я правільна разумею, гэта каталагізацыя існуючых тэкстаў.

*Бабкоў Ігар*. Ці была нейкая дынаміка ў развіцці ландшафту, пэўная паслядоўнасць.

*Казакевіч Андрэй*. Калі весці размову пра эвалюцыю ландшафту, то я магу сказаць нешта пэўнае толькі з пачатку 90-х. Больш аддаленая гісторыя мне дрэнна вядомая. Калі вызначыць галоўныя змены, якія адбыліся з канца 80-х, то гэта афармленне як моцнага даследчага масіву эмпірычнае сацыялогіі. Акрамя таго, толькі ў 90-х быў сфармаваны масіў ad hoc рэфлексіўных тэкстаў. Адбылася змена ролі і месца журналістыкі ў прадукаванні палітычнае веды. Падрабязнае вызначэнне дынамікі дыскурсаў у ландшафце даследавання палітыкі патрабуе асобнага дакладу. Адзінае, што варта зазначыць: сістэма эвалюцыянуе. «Барацьба» паміж сектарамі за Lebensraum ідзе няспынна.

*Мірашнічэнка Андрэй*. У меня только одно уточнение. Политология возникла в Минске только в 1989 г. До этого политологии не было вообще.

*Казакевіч Андрэй*. Паліталогія не была інстытуцыялізавана да 1989 г., але гэта не значыць, што не было палітычных даследаванняў ды не было прадукавання палітычнае веды.

*Мацкевіч Уладзімір*. Тут прэзентавана схема, і можна дапусціць, што любы тэкст, які звязаны з палітыкай і палітычнай ведаю, можа знайсці сваё месца ў гэтай схеме.

*Казакевіч Андрэй*. Ці ўтварыць свой уласны сектар, які недастаткова «заўважны», каб увайсці ў гэтую схему. Сюды можна далучыць любы тэкст, які мае прэтэнзію на прэзентацыю палітычнае веды для навуковае супольнасці.

*Абушэнка Уладзімір*. По тем правилам, которые заданы в этой «супольнасці».

*Казакевіч Андрэй*. Так.

[…]

*Мацкевіч Уладзімір*. Гэтая схема дапамагае знайсці шлях да папкі, дырэкторыі, у якой ляжыць тэкст, ці выпрацаваць стаўленне да гэтага тэксту, калі ён знаходзіцца ў той ці іншай структуры.

Вельмі складана, ці амаль немагчыма, каб гэта было адначасова. Калі мы ствараем нешта для таго, каб можна было нешта знайсці — гэта адно. Гэта мы робім на падставе пэўных апрыёрных уяўленняў пра тое, як больш зручна шукаць цікавае для нас. Іншая справа, калі мы, распісаўшы гэтыя тэксты ў таблічкі, пачынаем нешта новае разумець пра іх. Тады павінны быць крытэрыі, па якіх тэксты адносяцца ці туды, ці туды. Прайшлі пэўны крытэрый, апынуліся ў нейкай графе — тады пра гэтыя тэксты можна сказаць нешта змястоўнае.

*Казакевіч Андрэй*. Распісаўшы іх у «таблічку», мы пачынаем разумець, як гэтыя тэксты цыркулююць, кім прадукуюцца, кім спажываюцца. Больш за тое, мы можам зразумець, якім сімвалічным капіталам валодае тэкст.

*Мацкевіч Уладзімір*. Мой тэкст трапіў у пэўную графу, я як аўтар не маю права аспрэчваць гэта. Калі існуюць крытэрыі для азнаямлення, то ўсё нармальна. Калі гэтыя крытэрыі не выкладзены, я маю права патрабаваць адказу на пытанне: «Якую карысць мы будзем мець з гэтае схемы, з размеркавання пэўных тэкстаў у яе графы?»

*Казакевіч Андрэй*. Крытэрый — сфера прадукавання і функцыянавання тэксту і звязаныя з гэтым абмежаванні ў цыркуляцыі і выкарыстанні тэкстаў. Гэтыя крытэрыі не тычацца таго, пра што тэкст і як ён напісаны, але таго, як ён вызначае сваё месца сярод іншых тэкстаў, кім спажываецца. Пэўны тэкст з перыферыі з-за невыканання канону, напрыклад, вельмі цяжка выкарыстоўваць для спасылак у «інстытуцыялізаваных» працах (дысертацыя і г. д.), навучальным працэсе. Гэтыя тэксты адпачатку валодаюць недастатковай легітымнасцю. І наадварот, тэкст з «цэнтру» складана ўпісаць у кантэкст даследчае перыферыі, дастаткова ўявіць, наколькі складана адаптаваць тэарэтычны тэкст пра палітыку для поля журналістыкі.

*Мацкевіч Уладзімір*. Ты кажаш пра якасці, але я пакуль пытаюся пра крытэрыі, выкарыстоўваючы якія мы можам пэўны тэкст аднесці ў пэўную сферу.

*Бабкоў Ігар*. Тут гутарка ідзе пра прадукаванне палітычнай веды. Прадукаване *веды*. Гэтая схема можа быць праінтэрпрэтавана эпістэмалагічна і можа лічыцца пэўным тыпам веды. Гэта значыць, што кожны з гэтых сектароў мае, скажам, сваіх інстытуцыянальных вытворцаў і мае сваю аўдыторыю спажывання. Тэкст Мацкевіча і тэкст Вардамадскага маюць розную аўдыторыю. Цікава прагледзець дыверсіфікацыю аўдыторыяў спажывання і заказчыкаў гэтых тэкстаў.

*Крупнік Святлана*. Но должны быть критерии отнесения текстов к различным категориям.

*Бабкоў Ігар*. Не абавязкова, прынамсі, не абавязкова, каб гэтыя крытэрыі тычыліся зместу тэкстаў, іх якасці.

*Мацкевіч Уладзімір*. Калі гэтая схема — карысны элемент, то яна павінна мець механізм, якім адсейваюцца тэксты, якія не праходзяць выпрабаванне. Калі гэтага няма, то інструмент, прапанаваны тут, цалкам патрапляе ў сметніцу.

*Казакевіч Андрэй*. Крытэрыі задаюцца пэўнымі супольнасцямі вытворцаў і спажыўцоў. Тэкст адносіцца да пэўнае групы зыходзяцы з таго, як ён функцыянуе і спажываецца ў даследчым полі. Гэта аб'ектыўны, калі жадаеце, крытэрый.

*Мацкевіч Уладзімір*. Гэта адыход ад уласнае пазіцыі.

*Казакевіч Андрэй*. Не, гэта проста іншая даследчая стратэгія. Крытэрый не абавязкова павінен выяўляць якасць тэксту, ягоны змест. Гэтыя функцыі можа выконваць назіранне за цыркуляцыяй тэкстаў. У тэксце можа быць напісана ўсё што заўгодна, але галоўнае — вызначыць, у якой сферы ён функцыянуе і кім спажываецца.

*Абушэнка Уладзімір*. Тут вводится критерий не свойств текстов и того, как он сделан, но критерий легитимации. На какой-нибудь «классической» кафедре текст, который опознается как текст с периферии, никогда не будет признан полноценным. Он будет всего лишь периферией в глазах тех людей, которые разделяют определенные принципы легитимации.

*Казакевіч Андрэй*. Так. Такі тэкст у лепшым выпадку будзе дадатковым, факультатыўным, веданне якога зусім не абавязковае.

[…]

*Казакевіч Андрэй*. Акрамя акадэмічнае супольнасці існуе яшчэ некалькі супольнасцяў, якія прадукуюць уласны тып палітычнае веды. Галоўная з іх — палітыкі, асобы якія прымаюць палітычныя рашэнні, і людзі, якія проста заангажаваны ў палітычную дзейнасць (далей — проста палітыкі).

Такім чынам, я сфармулюю другую тэзу майго дакладу: ***палітычная веда «палітыкаў» не можа быць легітымавана праз навуковае даследаванне***. Перш за ўсё гэта тычыцца нашае сітуацыі. Калі для навуковае супольнасці галоўнымі сродкамі легітымацыі палітычнае веды выступаюць тэорыя, нарматыўная акты ды эмпірычная сацыялогія, то для супольнасці «палітыкаў» на першае месца выходзіць досвед. Затым ідуць сродкі масавае інфармацыі, ідэалогія і, у пэўнай ступені, эмпірычная сацыялогія. Механізмы атрымання

палітычнае веды адрозніваюцца прынцыпова. Арыентацыя на ідэалогію характэрна для палітыкаў з моцнымі уласнымі перакананнямі, схільных прыслухоўвацца да свайго ўнутранега голасу ды інтуіцыі. Палітыкі, для якіх большае значэнне мае настрой атачэння ці электарату, выбіраюць сродкі масавае інфармацыі і эмпірычную сацыялогію.

*Бабкоў Ігар*. Ці значыць гэта, што палітыкі, ці людзі, якія практыкуюць палітыку, знаходзяцца каля палітыкі, самі выпрацоўваюць для сябе пэўны тып веды пра палітычную рэчаіснасць, якая будуецца выключна на сітуацыі заангажаванасці ды ўдзелу.

*Казакевіч Андрэй.* Менавіта так.

*Абушэнка Уладзімір.* Есть еще тезисы?

*Казакевіч Андрэй.* Трэці тэзіс вельмі просты: ***палітычная веда грамадства (народа) фармуецца сродкамі масавае інфармацыі***. Сродкі масавай інфармацыі я тут разумею максімальна шырока. Гэта тэлебачанне, газеты, чуткі і іншыя другасныя крыніцы масавае інфармацыі (*інфармацыі-для-масаў*).

*Абушэнка Уладзімір.* Политическое знание «народа», таким образом, основано практически только на вторичных источниках информации.

*Казакевіч Андрэй.* Такім чынам, уласцівасці трох тыпаў палітычнае веды дазваляюць вылучаць чацвёрты тэзіс, які ўжо непасрэдна тычыцца даследавання палітыкі. ***Атрыманне веды пра палітыку магчыма толькі пры сітуацыі палітычнае заангажаванасці, удзелу ў палітыцы, удзелу (гэта ідэальная сітуацыя) у прыняцці палітычных рашэнняў.*** Сферы акадэмічных даследчых практык і практык уласна палітычных з'яўляюцца моцна ізаляванымі адна ад адной. Таму адказ на пытанне, пастаўленае ў пачатку даклада: «Што дазваляе праводзіць палітычнае даследаванне?» — гучыць такім чынам: «Устойлівы ўдзел у палітычнае актыўнасці».

Гэты тэзіс можна зрабіць больш «моцным». Інфармацыя з палітычнае сферы ў другасныя крыніцы і СМІ прыходзіць занадта позна. Больш за тое, існуе праблема цэнзуры. Цэнзуры «інстытуцыйнай», якая звязана з замкнёнасцю пэўных інстытутаў (Адміністрацыя Прэзідэнта, Рада Бяспекі і г. д.) і самацэнзуры. Напрыклад, даследчык, які падрабязна ведае механізм фінансавання апазіцыйных партыяў, не будзе пісаць пра гэта аналітычны тэкст, бо гэта пагражае стратаю доступу да аб'екта даследавання.

*Крупнік Святлана.* Возможно ли появление нормального политологического текста, который адекватно описывает существующую политическую реальность.

*Казакевіч Андрэй.* Мне цяжка адказаць на гэтае пытанне, але дакладна, што такі тэкст не можа напісаць даследчык, які дыстанцыяваны ад палітычнае дзейнасці.

*Крупнік Святлана.* Вы думаете, что участие обязательно для написания нормального политологического текста.

*Казакевіч Андрэй.* Я лічу, што так. Інакш проста не атрымаеш неабходную колькасць інфармацыі. Без удзелу яе атрымаць часта проста немагчыма.

*Мірашнічэнка Андрэй.* Значит ли это, что если вы пишете текст, участвуя в политике, то я, не участвуя в политике, не могу его понять.

*Казакевіч Андрэй.* Натуральна, што зможаце. Тут няма праблемы. Пытанне ў адэкватнасці.

*Бабкоў Ігар.* Наколькі я разумею, адбываецца праблематызацыя самога палітычнага даследавання. У беларускіх умовах гэтая праблематызацыя адбываецца такім чынам. Апісваецца структура прадукцыі палітычных тэкстаў і зазначаецца, што ўся гэтая прадукцыя не мае дачынення да палітычнага даследавання, таму што палітычнае даследаванне мае дачыненне з даследаваннем «жывое» палітычнае рэчаіснасці. Гэта самадастатковыя тэксты, якія абапіраюцца зусім на іншыя механізмы легітымнасці. З другога боку, існуюць палітыкі, якія ангажаваныя ў палітычную рэальнасць…

*Казакевіч Андрэй.* І прадукуюць гэтую рэальнасць.

*Бабкоў Ігар.* …Так, палітыкі карыстаюцца пэўным тыпам веды пра палітычную рэчаіснасць але не акадэмічным. Палітыкі, натуральна, таксама не вядуць палітычныя даследаванні. І тэза гучыць так: палітычных даследаванняў няма.

*Казакевіч Андрэй.* Не, гэта занадта «жорсткае» сцверджанне. Хутчэй, «жывых» палітычных даследаванняў вельмі мала, і яны не маюць выразнае інстытуцыялізацыі.

*Абушэнка Уладзімір.* В академическом сообществе производятся преимущественно симулякровые тексты, в политической сфере политическое исследование не производится, тут имеет место политическое действие и принятие политического решения. Вопрос: где вообще возможно нормальное политическое исследование и возможно ли?

*Казакевіч Андрэй.* Такія даследаванні магчымы ў межах акадэмічнае супольнасці, але яны валодаюць недастатковаю легітымнасцю і павагаю з боку гэтае супольнасці. Гэта праблема не месца, але статусу.

*Абушэнка Уладзімір.* Если кто-то проводит политические исследования, получается, его нет ни в сфере «академии», ни в сфере «политики».

Он не политик, не квазиполитолог, но где его позиция, если ему нет места ни там, ни здесь.

*Казакевіч Андрэй.* Недзе паміж.

*Кацук Мікалай.* На самом деле вопрос серьезный. Там, понятно, политика, здесь остепененный кандидат, доктор. Какие условия, нормы и так далее дают возможность заниматься политическими исследованиями? Необходимо изложить позиции, которые дают возможность для политического исследования, основанного на реальности.

*Казакевіч Андрэй.* Думаю, гэта ўдзел у абодвух сферах. Афармленне «ўласнае» прасторы ў межах інстытуцыялізаваных даследчых практык (атрыманне легітымацыі з боку супольнасці) і, адначасова, ангажаванасць у прастору палітычнага дзеяння. Быць у тым, што завецца «сітуацыяй паміж».

*Бабкоў Ігар.* Існаванне на пагранічч — дастаткова пашыраная палітычная і даследчая практыка. Можна нагадаць З. Бжазінскага, які стаіць на пагранiччы. З аднаго боку, ён заангажаваны ў палітыку, з іншага — піша палітычныя даследаванні. Яго аднакурснік С. Хантынгтан, які не заангажаваны ў рэальную палітыку і піша квазі/каляпаліталагічныя трактаты. Сутнасць вызначанай у дакладзе пазіцыі: пагранічча і ёсць сапраўдная пазіцыя палітолага.

*Крупнік Святлана.* Можно ли более подробно описать подобного рода деятельность?

*Казакевіч Андрэй.* Калі атрымоўваць палітычную веду праз корпус тэкстаў, то складаецца «ментальная мапа» (умоўна кажучы, тут левыя, тут правыя). Для ўдакладнення гэтае мапы даследчык павінен уключацца ў палітычную гульню, каб пацвердзіць ці абвергнуць «архіўную» веду, якую пішуць у праграмах ды дэкларацыях. Уключэнне ў палітычную гульню дазваляе бачыць палітычны ланшафт, які па-за межамі палітычнага дзеяння бачыць нельга.

*Абушэнка Уладзімір.* И дальше что?

*Казакевіч Андрэй.* Новы тып палітычнае веды і новы тып палітычных тэкстаў (іншых даследчых прадуктаў), якія можна (калі звесці ўсё да ўтылітарных рэчаў) проста прадаць. Па-другое, гэта можа быць проста больш прыемна, чым бясконцае сімуляванне даследчае дзейнасці. Па-трэцяе, стымулам з'яўляецца ірацыянальнае імкненне да веды, якое не можа быць задаволена наяўнымі практыкамі. Сапраўдныя матывы даследчых практык (сутнасна даследчых), я думаю, ірацыянальныя, і тут не варта спрабаваць іх рацыяналізаваць.

*Мацкевіч Уладзімір.* Докладчик рисовал круги с наложением текстов одни на других, совпадающих полностью либо частично. По отношению к текстам и явлениям это куда ни шло. По отношению к позициям это не допустимо, когда позиции спутаны. Условия, которые мы наблюдаем и в которых мы действуем, близки к хаотичным. Траектории не прописаны, тенденции не проявлены, и это характеризует нашу ситуацию.

Поэтому мы должны самоопределяться по отношению к этой штуке. Полезным является то, что помогает развести позиции, отделить оно от другого. Прописать хоть какие-то «нормочки». Помогает определиться с ситуацией, что в свою очередь помогает контролировать условия. Есть условия, которые мы можем контролировать, и есть, которых не можем. Только если какие-то условия мы контролируем, мы может, помещая в них объект, получать сведения о нем. Такие процедуры помогают нам от хаотичности, бесформенности прийти к некому порядку. Либо мы здесь только увеличиваем этот бардак.

*Абушэнка Уладзімір.* И еще один вопрос, который завис и никак не обсуждался. Каким образом позиция, которую занимает исследователь, удерживается, если он не действует ни по первой (академической), ни по второй (политической) норме? Нас интересуют не процедуры, как это делается, но как удерживается во времени. Этот вопрос можно обсудить, но нужно сделать перерыв.

[…]

*Абушэнка Уладзімір.* То, что у нас внутри семинара есть определенные противоречия и разные позиции, это следует обсуждать отдельно. Я остался убежденным, что работа, проделанная на предыдущих занятиях, не осталась доделочной.

Возник очень показательный вопрос. Значительная часть участников не так понимает либо очень широко трактует понятие нормы. И здесь мы имеем два пространства, где происходит нечто связанное с политическими и квазиполитическими исследованиями. И эти пространства действуют по четко определенным нормам. Вы приходите на кафедру, вас спрашивают: вы этот текст читали, не читали, идите и дотягивайтесь до уровня. Второе: пространство реальной политики, тут уже был показан механизм формирования политического знания в этой сфере. В этом пространстве действует определенная своя норма, которая разделяется политиками и в которую включены политики. Тут исследователь находит себя в качестве консультанта и т. д., при этом он не политик и не может взять для себя их норму для деятельности.

Он ни в академическом, ни в политическом пространстве. Тогда пошла разбивка — где? Если исследователь может руководствоваться тут одной нормой, там другой, все равно ни одна норма не является его собственной. В докладе заявлена не норма, но особая позиция. И в позиции политического

исследования ни одна из норм эту позицию не описывает. Если говорить, что происходит только комбинирование этих норм, это ничего не объясняет. И если вы говорите про позицию, особую позицию, с которой можно делать исследования, то такая норма у вас есть. И эта норма не артикулирована, не осознана и не предъявлена. Неважно, на уровне интуиции либо опыта она существует. Позиция станет особым пространством только тогда, когда она будет обоснованная норма.

*Казакевіч Андрэй.* Я, напэўна, не маю жадання выяўляць норму цалкам. Зазначу толькі, што тут пошук пэўнага месца на мяжы, дзе добрае веданне сучаснай тэорыі не перашкаджае дакрананню да «жывое» практыкі. Тут паўстае асобная праблема: рэальнасць павінна быць адрэфлексавана, а тэорыя — адаптавана да сітуацыі тут і цяпер. Крытыка павінна быць не спекулятыўнай, але павінна быць сінтэзаванаю з эмпірычнымі крыніцамі і ўласным досведам.

*Бабкоў Ігар.* Тое, што запытаўся Валодя, звязана з крышачку іншым. Тут мы бачым прастору разрыву. Адна супольнасць, другая супольнасць. Ідэя існавання на мяжы. Першая прастора — гэта выкладчыкі і эмпірыкі, якія не займаюцца палітычнымі даследаваннямі (прынамсі, звязанымі з апеляцыяй да рэальнасці). Тут выкладаюць палітычную тэорыю з невялікім дадаткам эмпірыкі. Што тычыцца эмпірычнае сацыялогіі, то яна таксама не даследуе рэальнасць. Тут прадаюцца дадзеныя пра палітычную рэчаіснасць заходнім (дзяржаўным) пакупнікам, якія хочуць кантраляваць і ўплываць на рэчаіснасць. Яны не купляюць палітычныя даследаванні, яны збіраюць эмпірычныя дадзеныя пра аб’ект і з гэтага спрабуюць нешта зрабіць.

Калі сур’ёзна ставіцца да пытання Валодзі і спрабаваць на яго адказаць, то прастораю палітычных даследаванняў мусіць быць вось тое месца на мяжы. Палітычныя даследаванні могуць адбывацца толькі тут. З аднаго боку, мы маем інстытуты палітычнае тэорыі, з другога — «шабашку» па продажы эмпірычных дадзеных. Палітычнае даследаванне можа быць толькі на памежжы. І нормы і сітуацыя мусяць быць сканструяваныя пад праект. Такім праектам можа быць часопіс, як выяўленне ідэі палітычнага даследавання. Сённяшні даклад — гэта спроба рэфлексіі з пазіцыі пагранічча.

*Абушэнка Уладзімір.* Опять же, концептуализировано *где-то*, с какой-то позиции, пространства, места.

*Кацук Мікалай.* Я бы хотел реконструировать сказанное. У нас есть научное сообщество как нечто. И нечто политическое. Политическая реальность. Научное сообщество имеет отношение к политике и производству знания. Это позиция, и ее можно достроить в ситуацию. Это позиция администратора от науки и, по большому счету, то, что они делают с политикой, — это архивация. «Вот взяли политику, вот у нас лежит на полке, возьмите». Следующая позиция — это политика. Политик принимает решения, законы и так далее. Его отношение — это отношение воздействия. Третье — это народ. С политикой он будет иметь дело через СМИ, это отношение восприятия. По сути, действия политического у народа нет. И наконец, третья позиция: субъект политического исследования. Вопрос: как задать отношение исследования? Возможна рефлексия, но пока это пустое место.

*Бабкоў Ігар.* А што калі рэфрексія і вынясенне ўсяго на абмеркаванне, можа, будзе дэструкцыяй пэўнай даследчай інтэгральнасці.

*Кацук Мікалай.* Как отличить тебя от политика или товарища, который имеет степень доктора наук?

*Казакевіч Андрэй.* Магчыма быць тым, хто *прыйшоў…*

*Абушэнка Уладзімір.* На этом будем, наверное, завершать. На сегодня семинар закрыт. Встречаемся через вторник.